Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес —2 р., 3 мес. —1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспадэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праудзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдацціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VII. 23 (7) лютаго (февраля) 1912 г. № 8.

## За апошні тыдзень.

—=—

### З Расеі.

Сумные думкі родзяцца ў галаве, чытаючы штодзенные весткі, што ў такім-то горадзі аддаюць пад суд за ашуканства інтэндандантоў, у другім—інжэнероў, ў трэйцім—іншых людзей, каторым гасударство і грамадзянство даручылі вясьці грамадзкіе справы, веручы ў іх сумленьне. Судзяць людзей з вышэйшых станоў, каторые, шукаючы для сябе карысьці, не задзержываліся ні перад чым, нават перад праліцьцем крыві. Па ўсей старане бытцым нейкая зараза запанавала.

Гэта зараза не абмінула і духавенства. І між духоўнымі адбіваецца тое, што робіцца ў грамадзянстве. Вось, чытаем у газэтных тэлеграмах, што ў Астрахані суд прыгаварыў на 8 гадоў ў каторгу сьвяшчэніка Строкова, каторы згвалтаваў дзяўчынку—сваю вучэніцу. Ізноў жэ ў Петрокове судзяць чэнстахоўскаго манаха, ксендза Мацоха; ён быў зышоўся з нейкай дзяўчынай, падфальшывіў для яе дакумэнты, краў грошы с кляшторнай кассы для гэтай сваей палюбоўніцы, пасьля выдаў яе замуж за свайго брата, ды, пасварыўшыся з братам, забіў яго сваімі рукамі. У гэтых справах Мацоху памагалі йшчэ другіе...

Усё гэта паказывае, што само жыцьцё у нас неяк ідзе крыва, кульгаючы. Жыць душна. А да гэтаго тые людзі, што з агульнаго гніцьця грамадзянства маюць лёгкую пажыву, стараюцца запаганіць душу народу, сеючы сваркі між людзьмі розных націй, розных вер.

Цяпер ў Пецербурзе заседае з'езд расейскіх націоналістоў. Мэта яго—вядомая: выдумляць спосабы, каб больш урэзываць правы „інородцоў“, ды згуртаваць так свае сілы, каб на выбарах у Чацьвёртую Думу „інородцоў“ не пускаць. А поруч з гэтым кіеўскіе чорнасоценцы падбухторываюць хрысьцян проці жыдоў. Тут судзяць зусім невінаватаго чэлавека—жыда Бэйліса, каторага западозрылі, бытцым ён забіў „на мацу“ хлопчыка-хрысцьяніна, Юшчынскаго. І хаця Бэйліса суд напэўна апраўдае, ўсё-ж такі, пакуль німа прыгавору, чорнасоценцы голасна вінавацяць жыдоў ў забіваньні хрысьціян! А цёмны народ слухае гэтай страшэннай байкі і ня ведае сам, каму верыць...

Найцяжэй ў такіх варунках жыць тым людзям, каторых жыцьцё толькі пачалося. Найгорш прыходзіцца моладзі: яна хочэ разагнаць тую грамадзкую заразу, каб і над ёй не запанавала. І вось вучашчыеся,—студэнты пачынаюць варушыцца. Па унівэрсытэтах падыймаюцца „безпарадкі“; ідуць сходкі, каторые паліція разганяе, і т. д.—Мы ня будзем ацэніваць іх паступкоў, але, кажучы аб іх, нельга не адзначыць, што прычына гэтаго руху—ня толькі нездавольство палажэньнем унівэрсытэтоў: і тут адбіваецца агульнае неустройства, разлад.

## У Думе і каля Думы.

Усё ідзе справа аб Холмскую губэрню. Цікавае здарэньне: на адным заседаньні Дума аткінула глаўную стацьцю закона, каб Холмшчыну аддзяліць ад Польшчы,—бо ў той дзень шмат „правых“ дэпутатоў не прыйшло. Тады яны ўсе грамадай прыйшлі на другое заседаньне, і стацьцю Дума зацьвярдзіла.

Ешчэ больш цікавая рэч вышла, калі разбіралі закон аб тым, каб паддзержаць выраб сельскагаспадарскіх машын ў Расеі, бо ім робяць вялікую конкурэнцію шмат лепшые загранічные машыны. У гэтым прыпадку ўсе селяне, каторые сідзяць пад камандай правых, зразумелі, што даваць падмогу фабрыкантам, каб яны выдзержывалі загранічную конкурэнцію, німа карысьці, бо фабрыканты, не баючыся конкурэнціі, ня будуць рупіцца аб палепшэньне сваіх вырабоў. І вось „правые“ селянскіе дэпутаты падавалі свой голас ў гэтай справе разам з „левымі“. Неспадзеваліся гэтаго камандзеры „правых“.

Як бачым, і селяне пачынаюць разумець, што карысць селянства—гэта адна справа, а палітыка „правых“—другая і нічога супольнаго з інтэрэсамі селян ні мае.

## З заграніцы.

У Англіі агульная забастоўка ўглекопоў захапіла ўсе капальні каменнаго вугля. Рабочые дамагаюцца, каб іх гаспадары згодзіліся назначыць цэну, меньш каторай нельга плаціць за работу. Фабрыканты-ж на гэта не прыстаюць: яны маюць свой хаўрус і ўсе разам працівяцца жаданьням рабочых. Цікава тое, што ад недахвату вугля ўсе фабрыкі Англіі павінны затрымаць работу; значыць, для ўсяго гасударства вялікую вагу мае тое, каб забастоўка скончылася хутчэй, і правіцельство, каторае зусім не мешаецца да забастоўшчыкоў, стараецца пагадзіць рабочых з іх гаспадарамі. Але і рабочые ў Англіі маюць свае хаўрусы, ў каторых з дробных частак сабралося багата грошы, дык ёсць за што жыць; вось, рабочые і ня хочуць нічога уступіць.

У справе замірэньня Італіі і Турэччыны пачынае нешта рабіцца. Гэтымі днямі Расея звярнулася да вялікіх дзержаў, каб супольне націскаць ваякоў, каб кінулі вайну.

Ходзяць весткі, бытцым Расея гатова за ўступку Трыполіса Італіі даць нешта Турэччыне на замену; для Расеі вельмі важна, каб на гэту вясну на Балканскім полуострові не ўзьнялася вайна, а яе ня будзе толькі тады, калі Турэччына будзе мець свабодные рукі і калі вайна з Італией скончыцца. Наагул кажучы, як толькі на Балканах неспакойна, дрыжыць і ўся Эўропа: гэтулькі рук выцягіваец,ца каб нешта сабе захапіць у завірусе, што дзяліцьба напэўна скончыцца агульнай калатнёй!

## Дарагоўля харчэвых прадуктоў і вываз іх заграніцу.

—

Ў адным беларускім мястэчку, дзеля таго, што хрысціянскі Вялікдзень у гэтым гаду разам с жыдоўскім, рабін абдумаў і пастанавіў, што на апошнім таргу перэд сьвятам, ніхто з перакупшчыкоў не павінен купляць яйкі на вывоз. Такім спосабам цэна адразу спадзець. Значыць, каб не вывазілі яйкі у гарады і заграніцу, то яны былі бы таннейшые. Цяпер у Вільні сярэдніе яйкі па 40—50 кап. дзесятак. Некуды вывозяць ешчэ збожжэ, масла, свіней, курэй, гусей, дзеля гэтаго цэна на іх стаіць вялікая.

Найбольш Расея вывозіць сваіх харчэвых тавароў у Англію, Немеччыну і др. краі.

Англія старонка фабрык і заводоў, яе багацтво каменны вугаль, гэты „хлеб“ промыслу. У Англіі мільёны людзей жывуць гандлем, працай фабрычнай і другой, сваім хлебам англійцы могуць пражыць толькі 5 месяцоў, 7 месяцоў яны „сталуюцца“ харчамі купленымі у другіх дзержавах; з Амэрыкі, Аўстраліі. Расеі, дзень і ноч вязуць паездамі, караблямі харчы, каб пракарміць 45 мільёноў англічан, багатые сталаўнікі добра за ўсё плацяць. Яны купляюць больш, як на 1,000 мільёноў рублёў розных харчэвых прадуктоў. У сярэднім кожны чэлавек гэтаго гасударства—горада купляець на 113 рублёў у год.

За апошніе гады вывоз харчэвых тавароў з Расеі агулам павялічыўся больш як у 2 с палавінай разы (136 працэнтоў), хаця трэба прызнацца, што мы вывозім не дзеля таго, што нам харчоў залішне, а дзеля таго, што нам патрэбны грошы.

У 1909 г. з Расеі вывезена збожжа на 830 мільёноў руб., і у Расею палілося загранічнае золота, гэта адазвалася на гасударственных даўгах, іх пачалі выплачываць. Ва ўсе банкі грошы прыбыло; у 1907 гаду па усіх банках казенных і прыватных лежала 1,644 мільёноў руб., ад 1911 гаду капітал падвоіўся—3,098 мільёноў руб. (больш 3 мільярдоў). Промысл і гандэль ажывіўся ад гэтаго залатога дажджу. Але мы вывезлі больш хлеба, як мелі права. У 20 губэрніях сёлета неураджай і Расея павінна купляць па дарагой цане хлеб з заграніцы.

З нашаго краю вывозіцца за граніцу масла, яйкі, сьвіньні, гусі, ракі, бульба. Лондон устанаўляе цэны у нас. Масла у Вільні 2—3 капейкі даражэй, як тое-ж масло у Лондоне, у Вільні масла прэснаго 50—55 кап. фунт, у Швэйцарыі, напрыклад цяпер фунт масла 48 кап.

Расея масла вывозіць на 50 мільёноў руб., яец на 70 міл. руб., дзічыны і др. на 15 міл. р.

Значыць, дарагоўля залэжыць ад вялікаго вывозу за граніцу, ад кепска нарыхтаваннай сельскай гаспадаркі, ад кепскаго нарыхтаваньня гандлю, і ешчэ, вучоные кажуць, ад таго, што золата вымываецца у капальнях новымі машынамі, шмат лягчэй так, што золота зрабілося таннейшым, адным словам, падзешавелі грошы. Апрача вывозу харчоў за граніцу павышаюць цэны ешчэ вялікіе купцы і фабрыканты, робячы паміж сябе хаўрусы, так, напрыклад, ужо колькі гадоў такі хаўрус (сындыкат) жалезных фабрыкантоў падняў, згаварыўшыся, цэны на жалеза, тое самае зрабілі мясные купцы у Варшаві; фабрыкантам цукру само міністэрства забараняець выраблядь шмат цукру, каб ён не падзешавеў, тое самае цяпер робяць ўладзельцы нефтяных промыслоў. На агул нарыхтаваньне экономічнаго жыцьця—гэта справа, каторай 3-яя Дума нават і пачатку ешчэ не зрабіла. Будзем чэкаць чаго кольвек ад новай Думы, каторую манімся выбіраць восеньню гэтаго году.

А. Ў.

## Што такое націоналізм.

—

Украінскі пісьменьнік С. Ефрэмов у „Радзе“ паясьняе, што такое націоналізм.

„Дваякі бывае націоналізм, пішэ Ефрэмов, лепей кажучы—ёсць два націоналізмы, ані трохі адзін на другі ня схожы. Адзін паступовы, творчы націоналізм, што вядзе націю у гару да адраджэньня, да сьвядомасьці сябе, як члена свайго народу, хоць і пакрыўджэнаго і зневажанаго, але ўсё-ж такі роўнаго усім іншым. Гэто націоналізм прыціснутых націй. Другі націоналізм-рэакційны, руйнуючы, каторы цягне націю у ніз, вядзе да разбрату, непрыязьні і сваркі, да національнай пыхі і засьляпленьня. Гэто націоналізм пануючых націй. Хоць і той і другі адным адзначаюцца словам, але лёгка дагадацца, што супольнаго між імі нічагусенькі німа, што гэто супроцілежные староны, усход і заход, сьвятло і цемнь.

Націоналізм для прыціснутай нації—гэто пытаньне быць-ці ня быць: ці жыць на белым сьвеці, ці жыўцом у дамавіну лажыцца. Найчасьцей бывае, што ў такіх паднявольных націй, сваей національнасьці трымаюцца; сьвядома ці не сьвядома, толькі ніжэйшые слаі нації—народ; верхняя-ж плеўка, вышэйшые клясы, па большай частцы прыстаюць да пануючай нації і памагаюць ня толькі экономічна ціснуць прыціснутых, але і національна прыпадобліваць да пануючых. Адгэтуль пайшлі тые абнемеччываньня, абпалячываньня, абрусеньня, мадзярызація і т.п. каторые трымаюцца часта працай рэнэгатоў, гэта значыць тых людзей, каторые здрадзілі свой родны народ. „Дзе добра, там наша бацькоўшчына“ — гэтая гідкая прыказка магла вытварыцца толькі сярод тых раскошнікоў, каторым запраўды скрозь добра, каторым і чэрці дзяцей калышуць, як кажэ наша прыказка. Прыціснутая нація пакінутая на божую волю ды на ласку вышэйшых станоў, бывае заўсёды дэмократычнай, бо змагаючыся за національнае вызваленьне і сваё національнае права, мае яна на увазі якраз інтэрэсы шырокіх мас народу, а не аднэй якой жменькі сярод іх. Такі націоналізм клічэ да сьветла, бу-

дзіць чэлавека у чэлавеку, прывучае шанаваць сябе самога і сваю людзкую годнасць. Творачы родную літэратуру і культуру, такі націоналізм бярэ ад вышэйшых станоў культурные дабычы і аддае іх народу. Націоналізм у прыціснутых націй бывае тэй творчай сілай, каторая вядзе народ да шчясьця, дабра і волі.

Саўсім іначы трэба глядзець на націоналізм пануючых націй, каторые ні маюць ніякаго національнаго уціску і не маючы ніякіх перашкод да свайго развіцьця пачынае ваеваць. Національнаго пытаньня у тэй чыстай і прынаднай форме як у націй прыціснутых, у іх німа, ды і быць ня можэ. Національные іхніе патрэбы задавальніваюцца поўнай мерай, не спатыкаючы ніякіх перашкод, Вось калі сярод такой націі вынікае націоналізм, то гэто значыць толькі, што тут пачалася нейкая хвароба, якая толькі прыкрывае націоналізмам нешта саўсім другое. Пануючы націоналізм выступае не для абароны самога сябе, бо німа ад чаго бараніцца, не за волю свайго народу, бо ніхто не пасягае на яе. Ён стараецца, як бы каго прыціснуць, як бы агранічыць і адабраць варункі да развіцьця другім націям. Не прыбольшываючы ні на макавае зярно дабра, ён зменшывае яго на тую сумму дабра, якую трацяць агранічэные ім націі. Найчасьцей такі націоналізм прыкрывае звонкім словам, жаданьне вытварыць прывілеі для пануючай націі коштам слабейшых, а то і ешчэ больш прыціснуць і скрыўдзіць іх. „*Имущему дано будет, и преизбыточествует, у неимущего-же отымется*“ такі кліч выстаўляе націоналізм пануючых націй.

Націоналізм на цяперашнім расейскім грунце значыць адно і тое самае, што і рэакція. Дык лёгка зразумець чаму гэты грунт ня можэ даць жывых сокоў паступоваму націоналізму“.

## Апошніе амэрыканскіе законы для эмігрантоў.

Паводле апошняго амэрыканскаго закону у Злучэных Штатах, дзеці каторые едуць да сваіх бацькоў у Амэрыку, не дастануць пазваленьня высесьці на амэрыканскі бераг, калі перэд выездам з Эўропы ня выбяруць так званы „Affidarit“, гэто такі дакумэнт, каторы выдаецца амэрыканскім урадам па нотарыяльнай просьбе бацькі, які абавязываецца выховываць дзіця і мае на гэта грошы. Гэты апошні закон датычэ дзяцей, каторые маюць менш 16 гадоў. Дык, калі-б хто высылаў дзіця у Амэрыку да бацькоў, то перш павінен дастаць гэты дакумэнт, яго можэ выбраць ад амэрыканскаго ураду бацька, або матка дзіцяці.

Дзеля таго, што тайные агэнты ашуківаюць часта эмігрантоў прадаючы ім карабельные білеты „шыф-карты“, даем тут, цяпер спісак цэн карабельных білетоў да Паўночнай Амэрыкі III-яй клясай.

З Гамбурга да Нью-Ёрку—91 р.
„ да Філадэльфіі—86 „
З Брэмы да Філадэльфіі—86 „
„ да Гальвэстон—86½ „
„ да Нью-Ёрку —91 „
З Роттэрдаму да Нью-Ёрку—90 „
З Антвэрпіі да Нью-Ёрку—90 „

Тут пададзены цэны разам с пагалоўным амэрыканскім падаткам ад эмігрантоў.

Цэны на праезд караблямі праз морэ, час-ад часу перэменяюцца.

Караблі, каторые забіраюць эмігрантоў у Паўночную Амэрыку адходзяць што суботу.

## Оклич.

На, скрыпулю! вось цымбалы!
Ты дуду сваю надзьмі;
Разам гучна ў склад удалы,
Так каб людзі не здрэмалі
Песьню лепшую пачні.

Стройна, складна песьню тую
Ў пералівы перавій,
Тую самую старую,
Што сьпевалі ў ноч глухую
З гора ў радасць пералій.

Вы жэ-ж, хлопцы і дзеўчаты,
Словы знаеце свае?!—
Ў голас разам,—як пачата,
Каб зрадзела наша хата,
Каб пачулі ўсе яе!...

Так зайграем, засьпеваем,
Гучна разам, тон у тон,
Каб за рэчкай, за Дунаем
І у гаі, і за гаем
Разыйшоўся гул-разгон!...

Каб салоўкі і зязюлі,
І крыніцы , і бары,
Зразумелі і адчулі,
Што ўсе гэта яны чулі,
Як наш прадзед пеў стары.

Ну дык разам, ўсё гатова!
Стройна, складна, тон у тон,
С пераліваў, слова ў слова
Так ад сэрца аж да Бога!...
...Размахніся-ж веча звон!!!

**Пілiпоў.**

## НЕДАСТУПНЫ.

Быў гарачы летні дзень, адзін з тых дзён, аб каторых гавораць: варыць, як у гаршчку. Далёкая цёмная палоска лесу абвязалася намiткаю сіневатай смагі, як маладзіца хусткаю, каб не так пякло сонцэ. Падыхаўшы зранку вецер сціхнуў саўсім; і здавалося, што ён сціхнуў не дзеля таго, што гэта так трэба, а зумыслу, на злосць ўсім тым сілам, да каторых належала не даваць у зьдзек гарачыні зусім распарэнай зямлі і ўсё яе стварэньне. Адным словам, здавалася, што вецер заздаваўся, як той дзядзька Піліп, каторы бачучы, што ён адзін толькі працуе у хаці, а ўсе туляюцца ад работы, як сабакі ад мух, і што адзін ён нічога ня ўскурае, плюнуў, кінуў работу і лёг у халадок, сказаўшы: „Чорт жэ вас бяры!“

І ціха было ўсюды. Маўчаў луг, маўчало поле; на вуліцы ў сяле не відаць было нікагутка. Толькі зрэдка перэбегаў з надворку у надворак сабака, высалапіўшы язык і шукаючы лепшай схаванкі ад мух. Праўда: дзень быў сьвяты. Селяне пахаваліся па халадкох, а Карусь Цесьля ешчэ ад снеданьня залёг на таку голым жыватом.

З аднаго канца вуліцы раптам выскачыла ў аднэй кашулі без шапкі не складная хвігура селяніна. Па тым, як нясьлі яго ногі, людзі свядомые адразу пазналі бы, што дзядзька Арцём крыху „хлясянуў“, што цяпер ня спрытнымі нагамі выратовываў сваю асобу і што з заду за ім павінна быць нейкая грозная сіла, ад каторай і нясьлі яго непаслушные ногі. Прабегшы некольькі хат, Арцём звярнуў на агароды, шуснуў у канаплі, адтуль разораю між капусты забег у надворак Юркі Труса, з надворку заламаў у вулачку і пасучыў проста к калодзежу. Дабегшы да студні, Арцём азірнуўся. Вуліца была пустая. Арцём ешчэ раз азірнуўся і, уляпіўшыся за зруб студні, перакінуў сваё цела у студню, павісшы на руках. Павісеўшы так с поўмінуты, ён высунуў сваю кудлатую ўскалмачэную галаву і павёў ею наўкруг. Як раз не далёка ад студні бегла с падаткнутаю спадніцай жанчына с качаргой ў руках, Арцём бордзенька схаваў за зруб галаву, зірнуў у ніз, пусьціў рукі і... шугнуў! Праз момэнт пачуўся глухі плеск вады. Калодзіж быў не глыбокі і вады у ім было мала. Шчасліва апынуўшыся на дне, Арцём трохі пачухаў цяжэйшае места і стаў прымайстроўвацца на скрыні. Скрыня заметна выдавалася над вадой. Арцём усеўся на адным яе берэзі, а ў другі упёрся нагамі. Тут ён пачуў сябе вольна і выгодна і уздыхнуў лягчэй.

Яму і самому ніколі не прыходзіла такая думка—ускочыць у калодзіж. . сё гэта зрабілося раптоўна, ад аднаго толькі жаданьня хітрэй схавацца ад жонкі. А як тут была прахаладзь ды спакой, то Арцём ад здаволеньня нават усьміхнуўся сам сабе. О, гэта то штука! Аб гэтым ўсё сяло загаворыць...

— Каб ведаў, то узяў бы с сабою тутун і люльку,—сказаў Арцём і плюнуў пад ногі.

Грыпіна, прабегшы агароды і Юркоў двор, згубіла Арцёмавы сьляды. Кінуўшыся туды і сюды, яна спынілася, момэнт раздумываючы над тым, куды прапаў Арцём. Хоць Арцём і нікога ні бачыў, лезучы ў калодзіж, але яго дагледзіў малы Пятрук, ён быў у суседзкім саду і бачыў праз шчыліны частакола, як дзядзька Арцём кідаўся ў калодзіж. І ў той момэнт, як Грыпіна ламала галаву, шукаючы Арцёма, Пятрук выбег на вуліцу.

— Цётка! дзядзька укінуўся у калодзіж! –закрычаў Пятрук палахлівым голасам.

Пятруковы словы чуць-чуць данясліся да Арцёма.

— А, пся мяць яго, злодзей! такі дасачыў! —падумаў, седзячы, Арцём.

Цётка Грыпіна выпусьціла качаргу і заламала рукі.

— А Божухна! а Матухна! Што ты Пятрук, гаворыш?!

— Даль-Бог жэ, цётачка, дзядзька укінуўся у калодзіж! Я сам бачыў,—чуць не плачучы, кляўся Пятрук.

Грыпіна, забыўшыся качаргі, кінулася да студні

— Арцём! Арцём! ці ты тут? Ці жывы ты, Арцёмка?!—галасіла Грыпіна, перэгнуўшыся над зрубам.

Арцём задраў у гару галаву, зірнуў на жонку і нічога не сказаў.

А за гэты час Пятрук абегаў ўсе вуліцы і падняў ўсё сяло. Падняўся крык, гоман, Студня бралася з бою, кожнаму хацелося зірнуць, што робіцца там, на дне. Самые лепшые мейсцы пазаймалі найболей паважные і сталые мужчыны. У адзін момэнт стала вядома, што Арцём жывы і здаровы. Там і сям, наўперад цішэй, а потым сьмялей, разносіліся вясёлые раскаты сьмеху.

— Бадай ты прапаў, Арцём! як ты залез сюды?—пытаўся Арцёма Антось Галавач.

— Дух Сьвяты занёс мяне, братко, — загаманіў Арцём, і голас яго вылетаў са студні глуха, як з магілы.

Стаяўшые каля студні перэдавалі другім Арцёмавы словы.

— Пьяніца ты, лодыр! дурасць твая, гарэлка уплішчыла цябе сюды! Гэта-ж трэба! пасароміўся-б ты людзей!—пачала адчытываць яго Грыпіна.

— Ну! ну! завела ўжо катрынку! Глуха загукаў Арцём з калодзіжа.—

Чаго ты лаешся, Грыпіна? —накінуўся на кабету Карусь Цесьля і міргнуў у бок мужчын: —мусіць добра яму жывецца с табой, калі чэлавек на зламаньне карку кінуўся у студню.—І, зірнуўшы на жанок, дабавіў: вось што робіць ваша грызьня з нашым братам...

— Гарэлка вам гэта робіць,— загаманілі жонкі дружным хорам.

Карусь замахаў рукамі і заткнуў вушы.

4)

## Гутаркі с чытачамі.

### Які шрыфт? *)

Ешчэ і дагэтуль надыходзяць да нас пісьмы з атказамі на пытаньне, якім шрыфтам друкаваць „Нашу Ніву“. Гэтак пішэ нам шляхціц с-пад Ашмяны: „Выпісываю тры газэты: беларускую, польскую і расейскую. Значыцца, чытаю у трох мовах і, здаецца, не павінен я прыдаваць якую колечы вагу да шрыфту. Але ўсё-ж такі стаю за лацініку і, каб „Наша Ніва“ далей друкавалася гэтымі літэрамі, даў бы 3 руб. заместа 2 руб. 50 кап.,—а калі і гэтаго мала, падпішуся адразу на 10 год, каб хаця дзеткі мае дачэкаліся газэты ў тым шрыфце, ў якім чытаем мадлітэўнікі. Мне-б папраўдзі ўсё роўна, якімі літэрамі чытаць. але ўсё-ж такі што забаронена, тое і бліжэй сэрцу і смачней. Ня можна вучыць дзетак на лацінскіх літэрах, ў школках так сама ня вучаць,—дзеля таго і стаю за лацініку“. Тое самае, хаця іншымі славамі, пішэ нам Я. Ю. Манц—іч з Гродзенскай губ. „У Сакольскім павеці ў заходняй часьці найбольш ёсць беларусоў каталікоў, каторые ні маюць ні воднай школы сваей. Ім трэба памагчы. Яны ўсе беларусы, сьпяць, ні маюць дзе вучыцца пасылаць сваіх дзяцей. Праваслаўные пасылаюць у школкі, дзе вучаць толькі па расейску,—а нам, беларусам-каталікам, трэба самім навуку здабываць і самім вучыцца па беларуску, ў сваей роднай мові. Нам і трэба беларускую газэту, друкаваную лацінскімі літэрамі, бо яны нам дарагіе і відней на іх чытаць. Я і сам самавукам вучыўся ў сваей хаці па беларуску лацінскімі літэрамі і дзеля таго, як чытаю па беларуску тымі літэрамі, дык мне здаецца, што душа мая са мною гутарку вядзе. Пакуль што ў нас ня ведаюць усе, што ёсць у нас кніжкі і газэты ў сваей роднай мові—па беларуску. Трэба ешчэ паказываць. Мы, маладые, ўжо пачалі пазнаваць сябе, і ёсць надзея, што знойдзецца нас сіла, калі будзеце друкаваць па беларуску лацінскімі літэрамі“.

Сьведомы беларус, каторы ўжо шчыра стаіць за сваё роднае,—такі беларус падае свой голас за той шрыфт, які можэ найбольш здаволіць беларусоў, а не палякоў, ці расейцоў, ды іх прыхільнікоў... Ён ўжо не глядзіць на форму значкоў, ці тая літэра будзе так закручэна, ці інакш. Для сьведомых беларусоў самае глаўнае — родные, беларускіе думкі. Што гэтак глядзяць на справу аб выбары шрыфту нашы беларусы, мы бачым з раней друкаваных лістоў, а так сама з лістоў Я. Сіні-аго з Смаргоні, Ф. Пац—іча с-пад Радашковіч, Я. Даніл—іча с Коўны, В. Грын—іча с-пад Ветрына, Г. Леўчыка з Слоніма, Б. Поч—ко і т. д. і т. д. „Трэба друкаваць тым шрыфтам, на якім больш расходзіцца газэта“ (Я. Сіні—кі) „Як ўсе, так і я“. (В. Пац—іч). „Мне дык ўсё роўна, хоць я і каталік“. (В. Грын—іч). „Я за гэтым, што здаволіць спрэчных“. (І, Даніл—іч) і т. д. Так нам пішуць сьведомые беларусы. Але несьведомых беларусоў ёсць ешчэ куды больш, як сьведомых, і яны, падбухторэные чужынцамі, чураюцца ўсяго свайго роднаго. Як быць с такімі людзьмі?—вісіць ізноў пытаньне. Іншые раяць апрацаваць новы шрыфт і ўжо новымі літэрамі ўсё друкаваць. Але трудна пайсьці за іх радай. Німа сваіх школ; німа ведама, ці хутка іх дачэкаемся;—і вось

*) Глядзі № № 4, 5 і 6 „Н. Н.“.

— А ніхай вас! вось сарокі! Толькі і астаецца уцекаць ад вас у калодзіж.

Карусь нагнуўся і клікнуў Арцёма.

— Арцём!„ці добра табе там?—

— Добра, браце! — адазваўся Арцём і заплюхаў нагой па вадзе: —такі табе тут халадок, што проста—ах!... Карусь! ты заўсёды быў мой лепшы друг: кінь, браце, мне сюды люльку!

— Вылазь брат! тут пакурыш. Вось і драбіны табе прынясьлі.

Некалькі мужчын паволі апускалі ў студню прынесеные драбіны.

— Сьцеражыся, Арцём!— крычалі яны, лёганька спускаючы драбіны.

— А на што мне драбіны?—пытаўся, седзячы на скрыні, Арцём: —думаеце, я вылезу ад гэтуль? Што я там буду рабіць з вамі? што мне там міла? нічога!.. Ня чуў хіба грызьні? А тут, браткі,—рай!—

„І гэй, ў Та-аганро-о-озі, да!
„І гэй, ў Таганро-о-зі да!“—

Зацягнуў Арцём ў калодзіжы песьню.

— Дык ты, Карусь, ня кінеш мне люльку?— скончыўшы сьпеваць, спытаўся ізноў Арцём.

— Татка, галубок! выла-а-а-зь! —заплакаў Арцёмоў сын, хлопчык гадкоў дзесяць.

— А! гэта ты, Сымонка? А сынок ты мой! Скажы мне, каток, які гэта прарок сядзеў у пустыні, і крумкачы насілі яму мяса?

— Выла-а-а зь!

— Я ў цябе, пся кроў твая, пытаюся: якому прароку крумкачы насілі мяса?—

— Выла-а-азь!

— Эх!—ўздыхнуў Арцём:—адзін шкадуе люлькі, і гэта лепшы друг! Другі ня хочэ сказаць, каму крумкачы насілі мяса, і хто? родны сын! І жыві ты пасьля гэтаго на сьвеці. Лепей бы ты мяне, матанька, на сьвет не радзіла—

І Арцём ізноў засьпеваў:

„На што ты радзіла
Мяне, матанька?
На што ты радзіла
На сьвет сіраціну?“—

— Доўга ты будзеш сядзець тут? падыйшоў да студні стараста і пачаў гаварыць з Арцёмам, як начальнік:—от зараз як улезу, то ты у мяне шпарка вылезеш!—

— А ну, ўлезь! Лезь, стараста! даль-Бог лезь! места хопіць і табе. Бо і твая Алена добрая жо-онка! (Ці там яе німа?) Дык лезь, стараста, лезь галубок!—І Арцём заварушыўся, пасунуўся, каб даць старасьці места.

— Тфу! каб ты згарэў!—плюнуў стараста і адыйшоўся пад сьмех селян.

— Карусь!—не сунімаўся Арцём—дык ты кінеш мне люльку?

— Лаві! я табе кіну!—сказаў Мікіта Чувель і ўжо выняў з губы сваю люльку.

— Я хачу, каб Карусь мне кінуў... Карусь! кін мне, брат, люльку!—

Карусь ужо быў нарыхтаваўся кідаць, ды Грыпіна вырвала люльку з рук Каруся.

— Ато-ж! Ешчэ чаго, патураць яму! Вылазь, каб ты бокам лазіў!

— Татачка, выла а-а-азь!—

— А скажы, як зваўся той прарок, катораму крумкачы насілі мяса?—не здаваўся Арцём.

Тут праціснуўся да студні Тарас Рубеж. І падыйшоў ён с такой мінай, што ўсе нявольна зірнулі на Тараса: на яго твары кожны прачытаў, што ён выдумаў спосаб выгнаць Арцёма са студні.

— Хлопцы!—сумыслу голасна загукаў Тарас, каб Арцём пачуў: вураднік прыехаў, будзе пратакол пісаць за незаконнае сабраньне! —І, звярнуўшыся да Арцёма, Тарас пачаў яго лаяць і крычаць:

— Скарэй вылазь, Арцём! Што ты нарабіў тут?! Прыехаў вураднік, будзе пісаць пратакол, бо ты смуціш сяло, зьбіраеш і валнуеш селян. Вылазь скарэй і хавайся, бо напішэ, пратакол, ў астрог пасадзяць!—

— Вураднік, кажэш?—спытаўся Арцём.

— Ня ўжо-ж хто! ён!—

Арцём забаўтаў абедзьвымі нагамі і зацягнуў:

„Адракомся ад стараго міра,
Атрасём яго прах з нашых ног“.

Селяне дружна зарагаталі.

— Марсільянку сьпевае!—

— Вось табе і Арцём! І вазьмі ты яго голымі рукамі.—

— Што мы, хлопцы, будзем цацкацца з ім? Бяры драбіны! Ніхай сядзіць!—Сказаў асаромлены Тарас Рубеж.

— Забірайце, забірайце, хлопцы!—гукнуў знізу Арцём,—бо яны мне замінаюць тут. А адгэтуль ня вылезу. Што вы да мяне маеце? Ня вылезу ды і годзі. Курыць не даецё, сказаць ня хочэце, каму крумкачы насілі мяса... Прашчайце, хлопцы!—І Арцём заварушыўся і адвярнуў голаву у куток студні.

— Кінь яму люльку! што с п'яным зробіш? Засьне, ешчэ захлынецца—пачуліся нягромкіе галасы.

— Арцём! Лаві!—крыкнуў Карусь і люлька паляцела ўніз, а праз мінуту с калодзіжа стаў узнімацца сіні дымок, як пара с катла.

— Дзе ты, Сымонка? Сымон!

— Чаго, татка?

— Ды як зваўся прарок, катораго крумкачы кармілі мясам?

— Ілля!—

— Ну, вот! даўно-б так гаварыў!

— Вылазь, татачка!—сказаў павесялеўшы Сымонка.

— Вылазь, Арцём! падурачыўся ды і будзе.—Загулі і селяне.

— А вы мяне любіце?—сказаў Арцём.

— Дзіва, што любім,—атказалі мужчыны.

— Я вылезу; але калі вы мяне запраўды любіце, то павінны згодзіцца на мае варункі. Дык слухайце: Грыпіна не павінна ні лаяцца, ні сварыцца.

Грыпіна! Чуеш ты там?

— Чую, чую! Ну, добра — ня буду!—

— Пабажыся!

— Даль-Бог, ня буду!

— Дык слухайце-ж далей: ўсе павінны разыйсьціся, каб ніхто ні бачыў, як я буду вылезаць. Згаджаецеся?

— Згаджаемся, згаджаемся!— Загаманілі мужыкі.

— Ну, то вылезаю!—

Драбіны заварушыліся, зараз жэ с калодзіжа паказалася кудлатая галава Арцёма.

**Тарас Гушча.**

*Лунінец.*

---

* * *

Не шумі, не гудзі,
Хваля бурнай рэкі
І сабой не будзі
Ты начное цішы;

Ніхай соладка сьпіць
На тваём берагу,
Хто прыйшоў атпачыць
Разагнаць маркату.

Ніхай сьпіць працаўнік,
Безпрытульнасьці сын
Яго хата й сем'я
Гэты берэг адзін...

**Цішка Гартны.**

*Рогоў* 1910 *г.*

---

# З Беларусі і Літвы.

(*Ад уласных карэспандэнтоў*).

**Мінск.** 25 январа быў сход губэрнскаго земскаго сабраньня. Адкрыў сход губэрнатар Эрдэлі. Ён казаў, што паветовые земскіе сходы неправільна разлажылі земскі падатак; падатак на зямлю павялічылі на 17 працёнтоў (трохі больш як на адну дзесятую), а на гарадзкіе і мястэчковые сялібы павялічылі на 102 працэнты (у дубэльт), а тым часам казенная палата апрэдзеліла з зямель на 17 працэнтоў больш, а з гарадзкіх сяліб на 60 працэнтоў.

Разбіралі просьбу барысаўскай земскай управы, каторая хочэ паставіць памятнік ў Барысаве, у памяць сталецьця вайны французскай 1812 г. Некаторые казалі, што німа чаго хваліць, бо адмірала Чычагова французы зваевалі тут. Доктар Ульянов радзіў лепш пабудаваць народны дом у Мінску, замест памятніка. Сабраньне перэдало справу у камісію з скольків гласных, каб яны гэта усе добра раскумякалі. Пастанавілі закрыць заразнае аддзеленьне пры бальніцы.

Пінскае земства просіць пазычкі ад казны 45,000 руб. на будоўлю школ,—адаслалі гэту просьбу у міністэрства народнай асьветы. Губэрнскі сход перэдаець усе пляны папраравы дарог у паветовые земствы, і дарожные капіталы так сама. Ад старога чыноўніцкаго земства дарожнаго капіталу перайшло 1 мільён 921 тысяча руб. Страхавога 703 тыс. р. страховаго добравольнаго 11 тыс.; штрафнога —64 тысячы руб., грошэй 685 тысяч руб. Сход адпусьціў 21,000 р. у Ново-Вілейскую бальніцу для вар'ятоў, каб яна прыймала хворых з Мінскай губ. і на могілеўскую фэльчэрска акушэрскую школу 12,000 руб. На губэрнскую бальніцу у Мінску—120 тыс. р., на пастэроўскую лекарню (дзе лечаць ад шалу). 14,090 руб.

= Нідаўна быў закрыт губэрнатарам «рускі прэдвыбарны камітэт», але усё такі гэтые людзі пад камандай архіепіскопа гатовяцца да выбароў у IV ую Гас. Думу.

Ці гатуюцца прогрэсіўные людзі у Мінску да выбароў?

*Мікола Камароўскі.*

**Вільня.** У Вільні ў нядзелю (12/II) здарылося ўбіўство у белы дзень, сярод людной вуліцы. Інжынер Можэйко спаткаўшы на рагу вуліцы Віленскай і Ягороўскаго праспэкту жонку сваю, каторая ішла са студэнтам Ліфшыцам, нічога не кажучы, дастаў с кішэні рэвольвэр выстрэліў у Ліфшыца і забіў яго на мейсцы. Посьле ўбіўства, Можэйко аддаў рэвольвэр паліціі, а сам сеўшы на ізвозчыка паехаў у паліцію і аддаўся у рукі паліціі.

= На гэтым жэ самым тыдні здарыўся і другі падобны выпадак у Вільні. У Ягораўскім рэстаране, дзе збіраюцца багачы, нейкая паненка, Нарбут, выстрэліла у бруха графу Вальдэмару Тышкевічу, але на сьмерць не забіла. Тут, так сама, кажуць, умешалася нейкая любоўная справа.

В. **Плюсты**, Віленск. губ. Ашмянскаго пав. Дзевянішскай воласьці. У нашай воласьці што далей, то ўсё лепей. У 1911 гаду лістапада месяца сабраліся усе гаспадары нашай Мількунскай грамады у воласьць і зрабілі прыгавор каб замяніць магазын на грошы, гэта значыць складаць грошы і разбіраць збожжэ, а зложэные грошы адаслаць у казначэйства і вельмі гэта добра зрабілі самі для сябе, бо што за карысць калі збожжэ гніе у магазыне, ні чэлавеку яно не прыгодна, ні скаціні, бо ніхто гнілога ня будз есьці. А грошы зложэные у казначэйство не згніюць а ешчэ працэнт прыбудзе. За нашай, і другіе грамады пачалі так сама рабіць.

У нашай вёсцы 29 студня выдаваў адзін гаспадар сваю дачку замуж. Хлопцы добра падвесяліўшыся, пабралі дзеўчат дый пайшлі лявоніху і другіе беларускіе танцы скакаць. Мужчыны убачыўшы гэта пабралі сваіх жонак і

---

дзеля таго ня можэм прыймаць новаго шрыфту, бо толькі сьведомые навучацца чытаць па іх, а для несьведомых беларусоў, каторых можна лічыць на мільёны, уся беларуская літэратура будзе недаступнай, як-бы чужой. Гэтым беларусам трэба даць у рукі гэткую кніжку, на каторай ім найлягчэй чытаць. І пытаньне: „Як быць? далей астаецца. Трэба што-колечы пастанавіць, бо далей так быць, як ёсць, ня можэ.

Проці таго, каб кінуць адзін шрыфт, пішэ да нас Тужбіца. Вось яго думкі аб гэтай справі:

„Мілые людзі, вы вядзецё спор аб тым, якім шрыфтам друкаваць беларускіе кніжкі і газэты, а не бачыце таго, што на беларускай зямлі ўжо колькі сот гадоў змагаюцца з сабой дзьве культуры—усходняя праваслаўная з заходняй каталіцкай; а шрыфт—гражданка і лацініка — гэта толькі зверхніе прыкметы гэтых двух кірункоў. Дзе дровы сякуць, там трэскі лятуць: дзе ідзе змаганьне, там ня можэ не астацца сьледу гэтай работы; а калі і як яно скончыцца, аб гэтым крыху рана гутарку весьці. Цяпер маем толькі адну пэўнасць, што адзін *нераздзельны* беларускі народ гукае аднэй мовай, карыстае з двух шрыфтоў і з дзьвёх вер, і з гэтым трэба лічыцца. Як пачнецё дабівацца аднаго шрыфту для ўсіх беларусоў то хутка можэ паступіць *раздваеньне* беларускаго народу; гэтаго трэба больш за ўсё пужацца. А само раздваеньне вось як можэ зрабіцца: Хай „Наша Ніва“ пачне друкавацца толькі гражданкай, знойдуцца людзі, што завядуць новую газэту і будуць яе друкаваць лацінскім шрыфтам. Паміж гэтымі газэтамі мала-па малу пойдуць сваркі, знойдуцца розніцы; адна з іх будзе ўсё цясьней і цясьней прыхінацца да культуры ўсходняй, а другая—да заходняй; гэтые розніцы і сваркі пяройдуць з газэт ў народ, і раздваеньне гатова! Тымчасам Бог—адзін, і розніца паміж верай каталіцкай і праваслаўнай ўжо не так мусіць вялікая, калі можна было зрабіць Унію (злучыць) гэтых вер, а, дзякуючы уніі, хоць яе і скасавалі, каталікі і праваслаўные беларусы і цяпер ешчэ жывуць з сабой у згодзі. Нарушаць гэтаго ня трэба, а справа шрыфту не павінна уціснуцца клінам ў народнае цела. Ніхай астаецца, як было дагэтуль. Рэдакція, каторая друкуе сваю газэту двумя шрыфтамі, як цяпер „Наша Ніва“, будзе трымацца сярэдзіны абодвых кірункоў. Яна будзе справедліва цэніць як ўсходнюю, так і заходнюю культуру, і ня толькі ня вызавець раздваеньня, а, наадварот, будзе рупіцца прымірыць гэтые два кірункі. Што рэдакціі цяжка друкаваць газэту двумя шрыфтамі, — гэта праўда, толькі ёсць для чаго і пацярпець, бо гэта ідзе на карысць для беларускаго народу; лепей падняць крыху цэну на газэту“.

Цікавая гэта думка, толькі, на жаль, ёсць у ёй адна вялікая абмылка: не злучаць у вадно дзьве культуры, не прымірыць іх толькі мае мэту беларускі рух, а рупіцца ён аб тое, *каб наш народ сам сваімі сіламі стварыў сваю, беларускую культуру*, Гэта ёсць гісторычная задача *жывога народу*; і хто гэта уцяміў, для таго пытаньне: якімі значкамі запісываць на паперы думкі беларусоў, ўсё тое, што яны твораць,—ні мае вагі.

**І. М—скі.**

(*Канец будзе*).

пайшлі танцаваць прыпамінаючы даўнейшые часы. Лепей за ўсіх танцаваў Пранук Казар, не малады ужо чэлавек, але як аказался, то за дзесяць маладых танцор. Былі хлопцы з дзеўчатамі і з другіх вёсак, але буянства ніякаго не было, нашы хлопцы абходзіліся з імі як з гасьцьмі чым выказалі свой такт і розум. На гэтым жэ вясельлі чыталі „Нашу Ніву“ і усе рады слухалі сваей роднай газэты.

*Пранук Субоч.*

М. **Прудзішчэ**, Віленск. губ. Вілейск. пав. Не шанцуе тутэйшаму тартаку. Сперша лопнуў вал; прыйшлося цягацца з ім ажно ў Варшаву, бо ані ў Мінску, ані ў Рызе, ні ў Вільні наладзіць не маглі, а тым часам народ пры тартаку цягаўся праз тыдні тры без заработкоў. Наладзілі вал, ізноў нейкі там штыфт сапсаваўся, ізноў прышлося ладзіць. Але лепш было-б, каб яго і зусім не наладзілі, як тое нешчасьце, якое сталося гэтымі днямі, калі ўжо тартак пайшоў у ход. Малады хлопец, каторы толькі што прыехаў сюды на заработкі, папаў пад пасы; момэнт —і ад беднаго дзяцюка цэлай знайшлі толькі галаву і адну руку, а ўсё цела парвала на кусочкі.

*Зніч.*

В. **Цімахі і Касьцевічы**, Гродз. губ. Воўкавыск. пав. Каля нас усюды выбіраюць грошы за магазын, некаторые вёскі пааддавалі, а іншые і спрэчаліся. Каторые атдавалі, грошы без сваркі, то у тых ўзысківаў стараста, а каторые спрэчаліся то у тые насылалі паліцію. Гэтые-ж дзьве вёскі як толькі пачулі, што паліція будзе выбіраць грошы на магазын—пастанавілі не даваць. Яны гаварылі між сабой, што як толькі прыедуць земскіе стражнікі, то не пусьцяць іх у сяло. 7 лютаго спраўнік узяўшы с сабой 56 земскіх стражнікоў, паехаў ў вёску Цімахі. У весцы ведалі калі прыедуць стражнікі і сабраліся усе. Як толькі угледзілі, што едуць стражнікі, то селяне усе выйшлі напроціў іх, як мужчыны так бабы і нават падросткі і хто с чым мог: хто с калом, хто з жалезнымі віламі, а хто і проста с камянём у прыполе. І як толькі пад'ехалі блізка іх стражнікі, так яны давай у іх пускаць каменьнем. Стражнікі не маглі устаяць і павінны былі адступіць назад. Доўга яны гэтак адны другіх то атціскалі то наступалі, але такі адзержалі верх стражнікі. Посьле гэтаго аказалася 7 чэлавек мужчын забітых і многа раненых. Стражнікі перамогшы і увайшоўшы у сяло змусілі заплаціць падатак, а як селяне заплацілі, то стражнікі пачалі іх браць пад арэшт. Пабачыўшы селяне, пачалі разбегацца хто куды мог: хто у лес, а хто у суседніе вёскі, так што у той дзень узята адно 15 чэлавек з вёскі Цімахоў, а на другі дзень з вёскі Косцевіч узята 25 чэлавек, за гэта самае. Рэшту паліція шукае.

*Ігнат.*

Г. **Воўкавыск**, Гродзенскай губ Атруціўся тут пісар у земскаго начальніка праз 70 рублёў, каторые ён прапусьціў.

= Каля **Воўпы** паявіліся ваўкі. Раз каля вёскі заступілі ваўкі аднаго чэлавека, то ён спаліў цэлую скрынку серчыкоў, а яны сядуць перад ім і зубамі ляскаюць, але яму неяк паручыло дабегчы да вёскі і нарабіць крыку. Збегліся людзі і тады ваўкі уцяклі.

= в. **Палаўкі**, каля Воўпы. Здарылося мне праежджаць на запускі праз гэту вёску і бачу у канцы вёскі ляжыць адзін чэлавек на сьнягу—мінаю, праехаў далей—другі, потым—трэйці і пакуль праехаў вёску то ўсё роўна як гусей тых гнаў. Пытаюся што гэта? Кажуць, што вясельле у вёсцы. Вось як людзі спраўляюць у нас вясельле—горш скаціны усякай.

*Баязлівы.*

М. **Здзітово**, Слонімск. пав. Гродзенск. губ., Нашы здзітоўцы з даўных часоў лічацца горкімі п'яніцамі; на іх нешчасьце у сяле ёсць манапалька, каторая апошніе гады стала таргаваць 12 тысяч рублёў у год. Вясельля спраўляюць тут 5—6 дзён і праз гэты час выпіваюць за 30—40 руб. гарэлкі. Іншы гаспадар у даўгі ўлазіць, а бярэ гарэлку; на хрэзьбіны ідзе так сама вядро—два гарэлкі, а як здарыцца у хаці якая хвароба, то німа за што паслаць па доктара, і завуць знахароў, шэптуноў. Даўней здзітоўцы далей суседняго села нідзе не бывалі, а як даведаліся аб Амэрыцы, маладзеж і хто толькі меў сілу і здароўе пакідалі свой родны кут, жонку, дзяцей гаспадарку, ды махнулі за морэ. Ведама, без гаспадара гаспадарка, як кажуць, плачэ, а жонка, робячы адна, ад цяжкай працы траціць здароўе, сілы і ў свой чарод плачэ. Глядзіш, маладзіца, каторая была, як рыжок, за 3—4 гады саўсім далася: адно косьці і скура. Бедные дзеці марнеюць. Чэкае бедная сем'я гаспадара і недажджэцца; дзеці выглядаюць бацькі у вакно і не дачэкаюцца. Так прахозіць колькі лет. Праўда, Амэрыка дае добрые заработкі, калі хто пападзе на добрую работу, шануе сябе, не п'янствуе; тады толькі можэ ён высылаць грошы да дому. Але бывае і так, што п'яніца прапівае у Амэрыцы грошы, а жонка і дзеці чэзнуць з голаду. Грошы сваіх на дарогу у Амэрыку часьцей за ўсё не маюць і пазычаюць на 36 працэнтоў.

Ні мала і такіх ёсць, што, вярнуўшыся з Амэрыкі, ўсе асьмакі, што цяжкім трудом зарабілі, прапіваюць і ізноў уцекаюць у Амэрыку, а сям'ю пакідаюць на Божую волю; жаль агартае глядзець на гэта. Калі-ж наш беларус прыйдзе да розуму, калі ён пачне жыць, як жывуць разумные людзі?

*Стары дзед Міхась.*

Сяло **Хоўбні**, Могілеўск. губ. Горэцк. пав. У нашай (Хаўбнянскай) воласьці разбіліся на хутары дзьве вёскі: у вёсцы **Церэхах** —усе, ў **Белі**—20 гаспадароў. Нагаварылі разыйсьціся на хутары вёску Белі вучыцелі, сыны тутэйшых гаспадароў. Астаўшыеся у вёсцы селяне казалі, што хутаране прападуць; але, калі убачылі, што яны і ў першым гаду ня мелі страты ў гаспадарцы, пачалі і самі пісаць прашэньня а раздзеле на хутары.

*С. К*

## *Ў турме.*

Настане дзень, ці ноч надойдзе,
Баліць, дрыжыць душа мая
І думка сьветласьці ня знойдзе,
І сохну я, і ныю я...
Дзьверы замкнутые
Сьцены халодные,
Рукі закутые!
Усюды няволя і цьма,
Ўсюды глухая турма!
У Ваконцэ гляну і заныю,
Забьецца сэрцэ у грудзях!...
Я ваш, турмы куты глухіе,
Але і вы не страх, не страх!

**Ф. Чэрнышэвіч.**

## З усіх старон.

**Пiцербург.** Пецербурскіе студэнты універсытэту ад нейкаго часу пачалі рабіць „байкот“ прафэсароў, назначэных правіцельствам, а не выбраных прафэсарскай радай. На гэтым грунці пачаліся апошніе студэнцкіе беспарадкі ў Пецербурзе. Абурэньне унівэрсытэцкай маладжэжы с кожным днём узрастае. Правіцельство стараецца перэламаць іх. 260 паліцейскіх уввялі ў сярэдзіну унівэрсытэту; на вуліцы перад унівэрсытэтам пільнуюць парадку ахраннікі, пешая і конная паліція. Вайстрэйшых выступоў не было. Паліція толькі стараецца, каб арэштаваць усіх, каторые байкотуюць прафэсароў, Удінцэва і Мігуліна. Мігулін на лекціі не прыходзіць. Удінцэв чытае лекціі перад 20 студэнтамі-саюзнікамі. Што ноч адбываюцца рэвізіі і арэшты студэнтоў; ў унівэрсытэці арэштавалі чатырох студэнтоў.

= Высняецца, што арэштаваны за растрату сіроцкіх грошы адстаўны генерал Тамашэвіч займаўся ешчэ і адвакацтвам, прысваіваючы сабе грошы людзей, каторые яму давераліся.

Правіцельство пазволіло будаваць чугунку ад Уральска да Семіпалацінска праз Орэнбург і Акмолінск.

**Масква**. За растрату у афіцерскім экономічным таварыстве штабс-капітана Яковлева засудзілі на год у арэштанцкіе роты.

= 4 марца адбудзецца ў Маскве ўсерасейскі з'езд, на каторым будуць радзіцца аб развіцьці ільнянаго промыслу.

**Кіеў**. Арэштавалі агента ахраннаго аддзелу, Клейна, каторы падкінуў аднаму чэлавеку рэчы па забітым Юшчынскім.

**Жытомір**. Валынскі губэрнатар Кутаісов падаўся ў адстаўку; на яго мейсцо назначылі Мельнікова. За той час, калі быў губэрнатарам Кутаісов, ўсё паднялося ў Валынскай губ: і хлебаробство і промыслы, але гэта не падабалася кіеўскім саюзнікам. Цяпер пачаліся там обыскі, забіраюць кніжкі, друкаваные па украінску, і др.

**Рэвель** (ад ўласнаго карэспандэнта). Гэтай зімой у латышскай староцы з'явілася цікавая шайка зладзеёў, каторая злажылася с колькі чэлавек розных націй больш цыганоў. Яны ездзяць па кірмашах на каторых прадаюць і меняюць коні і нагледзіўшы якога цёмнаго чэлавека каторы прадае добраго каня, пачынаюць у яго таргаваць і, ведама, пробаваць: ці рацівы і ці не кульгавы, праежджаюць. І той, хто паехаў пробаваць больш ужо не варочаецца с канём, а астаўшыеся ягоные сябрукі расходзяцца куды каторы, кінуўшы таму чэлавеку прыведзенаго худога, дрэннаго каня. А калі таму, каторы паехаў пробаваць каня не удасцца уцячы, зловяць яго і вернуць, то ён кажэ, што мы-ж паменялі коні. У гэты час непрыметна збіраюцца і яго сябрукі, каторые выдаюць сябе за астаронных людзей і сьведчаць, што яны бачылі як паменялі каней па добрай згодзе. Гэткіх здарэньнёў было ужо колькі у гэтым баку.

*К. О. Чэркас.*

**Сыбір. г. Кірэнск,** Іркуцкай губ. Каля гораду Кірэнска прытуліласця амаль ня сотня палітычных ссыльных. Шукаючы работы, зышліся яны сюды з усіх куткоў кірэнскаго павету, дый паспыняліся у ваколіцах, у вёсках, бо у горадзі жыць забараняецца. Невялікі гэта горад, але мае дзьве прыстані, дык кожын спадзеваўся паблізку зарабіць на кавалак хлеба. І запраўды, таму, хто ведаў якое майстарство, пашанцавало знайсці заработак, але гэткіх надта мала, рэшта, паабіваўшы парогі, стрэлася твар с тварам з магутным голадам. Калі дзе трапіцца, ідуць за хлеб у парабкі, згаджаюцца на ўсякую работу, абы не памерці з голаду. Ёсць многа гэткіх, што німаюць у ва-што ані абуцца, ані апрануцца. На дварэ сыбірская сьцюжа, а тут ня дзіва спаткаць на вуліцы „палітыка“ у адным кулёчку. Тутэйшы народ ніколі не бачыў гэткаго здарэньня і вельмі дзівуецца, што „які трывалы расейскі чэлавек“... Іншые праз колькі гадоў не бачылі гарачае стравы, жывяцца адным хлебам, ды і то, калі з дому прышлюць рубельчык ці два; а як не, то па колькі дзён сьвятым духам седзяць. І гібеюць людзі бязконца, гінуць марна, як мухі у восень. Той занядужае ад холаду і голаду ды памрэ, а той ня вытрывае ды сам сябе звядзе са сьвету. С таго ліку таварышоў з якімі я прыйшоў, гэткім парадкам страцілося ужо 9 чэлавек. Ды каб вы ведалі, мае землякі, якіе гэта усё людзі маладые, пісьменные, надта патрэбные нашай гаротнай старонцы... Ніхто ня ведае, што здарыцца заўтра, ніхто не бярэцца сказаць, ці хопіць магчымасьці прагнаць заўтрашні дзянёк. Боязна зірнуць у вочы заўтраму, бо яно, як ваўкалак, стаіць, выскаліўшы зубы...

Да гэтаго ешчэ прылучаецца нуда па роднай старане. Сэрцэ заходзіцца ад жалю, што можэ ніколі не давядзецца хадзіць па родных сьцежках, ніколі не пачуць тых мілых песень, якіе сам сьпеваў з маленства. Таварыш мой усхопіцца у ночы, ды пачне заганяць гусей: „гыля, гыля!“. Потым прачнецца, зьвернецца да мяне, ды запытае: „Ці німа у нас лустачкі хлеба? Ну, хоць малюсенькае скібачкі?...“— „Німа, братка! сам ведаеш: учора з'елі“... Ды ужо ня сьпіць усенькую ноч, усё варочаецца, уздыхае і думае... Што-ж ён думае?—ці ня можэ хто адгадаць?

**Язэп Лосік.**

*Сс.-п. Мартыноўскай воласьці.*

Рэдактар-Выдавец
Ўласоў.

**Przegląd Wileński**

**Tygodnik polityczny, społeczny i literacki.**

Wychodzi w WILNIE

REDAKCJA i ADMINISTRACJA

*S-to Jerska 15 m. 26.*

**Cena prenumeraty**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Rocznie w Wilnie | 6 r. | z przesyłką pocztową | 7 r. |
| Półrocznie | „ 3 r. | „ | 3.50 k. |
| Kwartalnie | „ 1.50 k. | „ | 1.75 k. |
| Miesięcznie | „ 50 k. | „ | 60 k. |

Kierownik pisma **Ludwik Abramowicz.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская, д. № 20.